***Я.А. Бодрыкаў***
БДУ(Мінск)

# РОЛЯ УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ПІЧЭТЫ Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

З канца XVIII ст. беларускія землі знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Гэтая акалічнасць ўплывала не толькі на грамадска-палітычнае жыццё краіны, але і на стан айчыннай навукі, якая трапіла пад моцны расійскі ўплыў. Яшчэ ў XIX ст. наспела неабходнасць стварэння новых ВНУ на беларускіх землях, аднак да 1921 г. гэта пытанне так і не засталося вырашаным.

Новыя магчымасці для існавання і развіцця беларускай навукі з’явіліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., калі беларускія навукоўцы і культурныя дзеячы ўсё актыўней пачалі патрабаваць ад новых уладаў адкрыцця ўніверсітэта ў Беларусі.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт пачаў сваю працу 30 кастрычніка 1921 г. Першым рэктарам БДУ стаў вядомы гісторык У.І. Пічэта (1878 – 1947), які прыклаў шмат намаганняў для стварэння гэтага ўніверсітэту.

Уладзімір Іванавіч нарадзіўся ў 1878 г. у Палтаве. Яго бацька, Іван Хрыстафоравіч Пічэта (серб па паходжанню), быў рэктарам Віцебскай, а пасля Палтаўскай духоўнай семінарыі. Сын, як і бацька, абраў навукова-выкладчыцкую кар’еру і ў 1901 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэту, дзе яго навуковым кіраўніком быў знакаміты прафесар В.В. Ключэўскі. Пасля свайго навучання У.І. Пічэта працаваў выкладчыкам у розных навучальных установах, у 1917 г. стаў выкладчыкам Маскоўскага ўніверсітэту, а ў 1918 г. прафесарам. У тым жа 1918 г. выйшла ў свет першая значная праца навукоўца па гісторыі Беларусі «Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве». Увогуле, гісторыя ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а таксама месца беларускіх земляў у гэтых дзяржавах былі сферамі навуковага інтарэсу даследчыка. Сваёй працай У.І. Пічэта зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай гістарычнай навукі. З 516 работ навукоўца больш за 150 прысвечаны гісторыі Беларусі. Тэмы даследаванняў закраналі пытанні

этнагенезу беларускага народа, гісторыі беларускіх гарадоў, археалогіі і краязнаўства Беларусі, гісторыі беларускай мовы і беларускай літаратуры.

Цяжка перааацаніць унёсак навукоўца ў беларускую гістарычную навуку, але працу У.І. Пічэты нельга абмежаваць выключна даследаваннем гістарычных тэм. Навуковец не толькі даследаваў гістарычныя працэсы, але і сам вырашыў вялікае гістарычнае пытанне – стварэнне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Шмат зрабіў У.І. Пічэта і на пасадзе рэктара БДУ, якую ён займаў ад стварэння ўніверсітэта ў 1921 г. да 1929 г., пакуль не быў зняты з пасады. За гэты час колькасна і якасна пашырыўся склад навуковых супрацоўнікаў БДУ, ствараліся новыя факультэты, пачалося будаўніцтва новых памяшканняў для ўніверсітэту, на базе бібліятэкі БДУ створана Дзяржаўная бібліятэка БССР. Але, усе гэтыя дасягненні не выратавалі У.І. Пічэту ад рэпрэсій. Першы рэктар БДУ праходзіў па так званай «Акадэмічнай справе», быў зняты са сваёй пасады, пазбаўлены звання акадэміка і сасланы. Ссылка моцна адбілася на здароўі навукоўца, але, дзякуючы інтарэсу да У.І. Пічэты міністра замежных спраў Чэхаславакіі Э. Бенеша рэпрэсіі супраць яго скончыліся. Рэпутацыя вядомага аўтарытэтнага навукоўца-славіста выратавала У.І. Пічэту, але сваю працу на пасадзе рэктара БДУ ён ужо не аднавіў. З другой паловы 30-ых гг. У.І. Пічэта пачаў актыўна даследаваць гісторыю Польшчы, у рамках якой закранаў таксама і пытанні беларускай гісторыі. Ён памёр у 1947 г., так і не скончыўшы 3-ці том сваёй апошняй працы «Гісторыя Польшчы».

Навуковая дзейнасць і дзейнасць У.І. Пічэты на пасадзе рэктара БДУ мела вялікае значэнне для беларускай навукі, якая ў гэты перыяд дасягнула якасна новага ўзроўню і набыла моцны патэнцыял для будучых даследаванняў. Асаблівай павагі заслугоўвае дзейнасць У.І. Пічэты, як правадніка і рэалізатара ідэі стварэння БДУ, а таксама яго дзейнасць на пасадзе першага рэктара БДУ з 1921 па 1929 гг.